Меркаванне навукоўцы

ЛІНГВІСТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАФЕСАРА МІКАЛАЯ АБАБУРКІ

Навуковай грамадскасці Беларусі, беларускім настаўнікам, выкладчыкам устаноў вышэйшай адукацыі добра вядома імя доктара філалагічных навук, прафесара Мікалая Васільевіча Абабуркі, які працуе выкладчыкам беларускай мовы ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова з чэрвеня 1970 г., прычым працуе надзвычай паспяхова і як вучоны-мовазнавец. Асабліва ўражвае яго вялікі ўнёсак у беларускую лінгвістычную навуку і навукова-метадычную працу.

Назавем і коратка ахарактарызуем кнігі, манаграфіі і вучэбныя дапаможнікі прафесара М. Абабуркі.

Слоўнік-даведнік "Дыялектызмы ў творах беларускіх савецкіх пісьменнікаў" (1979) – першая спроба выяўлення і сістэматызацыі дыялектных слоў у творах беларускіх празаікаў XX ст. У метадычнай працы «Пытанні і заданні па курсе "Лінгвістычны аналіз тэксту"» (1980) падаюцца прыблізныя схемы разбору паэтычных, празаічных і драматургічных тэкстаў, самі тэксты ці ўрыўкі з іх, а таксама пытанні і заданні для самападрыхтоўкі і самакантролю студэнтаў. У манаграфіі "Стылістычна абмежаваныя словы ў мове беларускай мастацкай літаратуры" (1981) даследуюцца ў стылістычным і этымалагічна-семантычным аспектах рэгіяналізмы ў мастацкай літаратуры. У 1981 г. у акадэмічным выдавецтве "Навука і тэхніка" выйшлі "Матэрыялы для абласнога слоўніка Магілёўшчыны". Адзін з аўтараў гэтай працы – М. Абабурка.

Манаграфія "Беларускае слова і яго вывучэнне" (1986) прысвечана пытанням беларускай лексікалогіі і методыцы выкладання лексікалогіі ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе. У працы "Развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры" (1987) паказаны шляхі фарміравання беларускай вершаванай і празаічнай мовы. Шмат увагі аддаецца ўзаемадзеянню вусна-гутарковага і кніжна-пісьмовага маўлення ў мове літаратурна-мастацкіх тэкстаў беларускіх пісьменнікаў. У навучальным дапаможніку "Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў" (1992) праводзіцца параўнальны і супастаўляльны аналіз беларускай і рускай моў як у дыяхранічным, так і ў сінхранічным планах. У кнізе "Культура беларускай мовы" (1994) у навукова-папулярнай форме разглядаюцца пытанні правільнасці, дакладнасці, лагічнасці, дарэчнасці, чысціні, выразнасці і багацця сучаснага беларускага маўлення. Дапаможнік "Асновы лінгвістыкі літаратурна-мастацкага тэксту. Матэрыялы да спецкурса" (1997) змяшчае тэарэтычныя і метадычныя рэкамендацыі, узоры аналізу паэтычных, празаічных і драматургічных тэкстаў ці ўрыўкаў з іх, а таксама схемы такога аналізу. "Слоўнік-даведнік асноўных лінгвістычных і тэксталагічных тэрмінаў" (у 4 ч., 1998 – 2010) тлумачыць "хадавыя" тэрміны сучаснай беларускай лінгвістычнай стылістыкі і тэксталогіі.

У 2000 г. выйшлі кнігі "Станаўленне і развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры" і «Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі студэнтаў па дысцыпліне "Сучасная беларуская літаратурная мова". Ч. 1», у 2001 г. – «Дапаможнік па спецкурсе "Пераклад рускамоўных тэкстаў на беларускую мову"», у 2003 г. – кніга "Тэарэтычныя асновы беларускай лінгвістычнай тэрміналогіі".

"Матэрыялы да абласнога слоўніка Магілёўшчыны. Вып. 2" (2004) укладзены М. Абабуркам разам з іншымі аўтарамі. Акрамя дыялектнай лексікі змешчаны выслоўі і звязныя тэксты з асаблівасцямі мясцовага маўлення.

Кніга "Ад гутарковай мовы да літаратурна-мастацкага тэксту. На матэрыяле твораў М. Зарэцкага" (2005) падрыхтавана ў суаўтарстве з І. Ячмянёвай. У навучальным дапаможніку манаграфічнага тыпу даследуюцца элементы вусна-гутарковага маўлення беларусаў і паказваецца іх роля ва ўтварэнні літаратурна-мастацкага выказвання (тэксту). У калектыўнай манаграфіі "Мова сучаснай беларускай мастацкай літаратуры" (2005) разглядаюцца тэарэтычныя пытанні мастацкасці тэксту, паказваецца структура мікра- і макравобразаў, спецыфікі ідыястылю А. Макаёнка і В. Быкава. У дапаможніку "Тэорыя і практыка перакладу" (2007) разглядаюцца агульныя і прыватныя пытанні перакладазнаўства як навукі, тыпы і разнавіднасці перакладу, спецыфіка перакладу рускіх тэкстаў на беларускую мову і беларускіх – на рускую.

Прафесар М. Абабурка ў 2008 г. выдаў дзве салідныя кнігі. У "Лінгвістыцы тэксту" раскрываюцца прадмет, змест і задачы спецдысцыпліны, паказваецца яе сувязь з іншымі навучальнымі дысцыплінамі, падаюцца звесткі з гісторыі станаўлення і развіцця лінгвістыкі розных тэкстаў у старажытнай і сучаснай Беларусі. У ма-

награфіі "Беларуская лінгвістычная паэтыка і тэксталогія" разглядаецца беларуская лінгвістычная паэтыка і тэксталогія як самастойныя адгалінаванні беларускай філалогіі.

Яшчэ дзве кнігі М. Абабуркі выпушчаны ў 2010 г. У вучэбна-метадычным дапаможніку для студэнтаў "Рознастылёвыя тэксты і іх аналіз" паказваецца сутнасць тэксталінгвістыкі як навучальнай дысцыпліны, раскрываецца яе прадмет, задачы і змест, падаюцца тэксты розных стыляў і жанраў сучаснай беларускай літаратурнай мовы разам з метадычнымі парадамі і заданнямі для самастойнай работы студэнтаў. У працы "Стылізаваныя і сінтэзаваныя тэксты. Кантэксталагічны аналіз" паказваецца сутнасць сінтэзавання і стылізацыі тэкстаў пад вуснае ці пісьмовае маўленне персанажа ў літаратурна-мастацкіх творах. Вызначаюцца шляхі, метады і прыёмы аналізу стылізаваных і сінтэзаваных тэкстаў на занятках па лінгвістыцы тэксту.

Манаграфія "Паэтыка беларускай літаратуры XVI – XIX стст." (2011) прысвечана апісанню моўна-выяўленчых і стылістычных сродкаў старой і новай беларускай мовы, а манаграфія "Сучасны літаратурна-мастацкі расповед" (2011, суаўтар В. Саўчанка) – даследаванню апавядальнай мовы.

У 2011 г. выйшаў у свет слоўнік-даведнік "Лінгвастылістычныя і тэксталагічныя тэрміны", а ў 2012 г. – "Слоўнік лінгвастылістычных і тэксталагічных тэрмінаў" (суаўтары Т. Казімірская і В. Саўчанка), у 2012 – 2013 гг. – дапаможнік "Сучасная беларуская літаратурная мова. Пытанні і заданні" (у 2 ч.), у 2014 г. – кніга "Вывучэнне мовы Аркадзя Кулешова" і манаграфія "Паэтыка беларускай мастацкай літаратуры XX ст." (суаўтары А. Папейка і А. Абабурка).

Мікалай Абабурка падрыхтаваў і выдаў 42 манаграфіі, кнігі і брашуры. Акрамя гэтага, вучоны апублікаваў больш за 200 навуковых артыкулаў і рэцэнзій па праблемах філалогіі. Навуковая і навукова-метадычная "прадукцыя" прафесара М. Абабуркі вылічаецца сотнямі ўлікова-выдавецкіх аркушаў. Такім салідным творчым навуковым набыткам можа пахваліцца не кожны. Імя прафесара М. Абабуркі ў беларускім мовазнаўстве стаіць у адным шэрагу з такімі імёнамі, як М. Булахаў, А. Булыка, А. Каўрус, І. Лепешаў, В. Мартынаў, А. Міхневіч, В. Старычонак, якія ў апошнія дзесяцігоддзі ўнеслі ў беларускую лінгвістыку, філалогію вялікі ўклад.

Пры Магілёўскім дзяржаўным універсітэце па праблемах мовы беларускай мастацкай літаратуры, тэксталогіі, паэтыкі прафесар М. Абабурка стварыў навуковую школу, амаль 50 гадоў жыцця ён аддаў падрыхтоўцы педагагічных і навуковых кадраў. Тысячы і тысячы былых яго студэнтаў сталі настаўнікамі роднай мовы і літаратуры, многія з аспірантаў – кандыдатамі філалагічных навук.

Лічу, што доктар філалагічных навук М. Абабурка даўно заслугоўвае прысваення яму ганаровых званняў, такіх, як заслужаны дзеяч навукі або заслужаны работнік вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь, іншых дзяржаўных узнагарод.

Трэба нагэта адзначыць, што Мікалай Абабурка вядомы чытачам і як майстар мастацкага слова. Тут ён выступае пад літаратурным псеўданімам *Мікола Бабраўчэм*. Яго апавяданні, мініяцюрныя замалёўкі, эсэ публікуюцца ў беларускіх часопісах і газетах.

І вось перада мной ляжыць стос з 6 манаграфій, пушчаных у вялікі свет выдавецтвам УА "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова" з агульнай лічбай улікова-выдавецкіх аркушаў 109,1. Усё гэта здзейснена ў 2000 – 2014 гг. Мяркую, што для ВНУ гэта навуковы подзвіг. З улікам наватарска-інавацыйнага выканання тэмы "Мова беларускай мастацкай літаратуры" (ад "Слова пра паход Ігаравы" да п'есы "Дагарэла свечачка..." А. Петрашкевіча) выканаўца гэтых манаграфій прафесар М. Абабурка выглядае сапраўдным волатам. Недарэмна прафесар БДУ М. Прыгодзіч назваў яго "вядомым у Беларусі лінгвістам... працы якога ў галіне стылістыкі мастацкага слова і культуры літаратурнага маўлення сталі класічнымі і шырока выкарыстоўваюцца ў практыцы выкладання беларускай мовы і літаратуры ў ВНУ і сярэдніх навучальных установах краіны" (Роднае слова, 2011, № 5, с. 60).

Падрыхтаваная М. Абабуркам да абароны ў 1988 г. доктарская дысертацыя "Развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры" на аснове аднайменнай манаграфіі, якую надрукавала акадэмічнае выдавецтва "Навука і тэхніка" ў 1987 г., не была рэкамендавана кафедрай, дзе працаваў вучоны, з-за адсутнасці ў Савецкай Беларусі дактароў навук па распрацаванай дысертацыйнай тэме. Дысертанту давялося чакаць амаль 13 гадоў, пакуль, ужо стаўшым пенсіянерам, атрымаў дазвол на жаданае мерапрыемства, без якога ў 1996 г. быў зацверджаны ВАКам Рэспублікі Беларусь паўнамоцным прафесарам на кафедры беларускай мовы.

Сёння, калі, здавалася б, усе шлагбаумы зняты, перспектыўная і наватарская тэма прафесара закрыта, і вучонаму, як кажуць у народзе, зноў перакрылі кісларод: маўляў, тэматыка і праблематыка, як і сам іх выканаўца, састарэлі. І гэта пасля выхаду ў свет такіх арыгінальных публікацый.

У 1988 г. мне давялося рэцэнзаваць манаграфію М. Абабуркі – аснову яго доктарскай дысер-

тацыі – у "Весцях АН БССР" (серыя грамадскіх навук, № 4, с. 124 – 126), дзе ўжо тады было адзначана, што навуковая канцэпцыя М. Абабуркі будуецца на канцэпцыі мастацкай літаратуры як сінтэзе розных мастацтваў, тыпаў і спосабаў вобразнага адлюстравання (мадэлявання) аб'ектыўнай рэчаіснасці. Лічачы мову беларускай мастацкай літаратуры адной з асноўных функцыянальных разнавіднасцей беларускай літаратурнай мовы, М. Абабурка падкрэслівае, што яна мае сваю сістэму моўна-выяўленчых сродкаў, якія адлюстроўваюць рэчаіснасць праз вершавана-паэтычнае, апавядальна-празаічнае і дыялагічна-драматургічнае маўленне пісьменнікаў.

І сёння М. Абабурка бачыць станаўленне і развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры ў мастацкім сінтэзе мовы беларускага фальклору і дыялектнай мовы беларусаў, беларускай вуснай (гутарковай) і пісьмовай (кніжнай) мовы, а таксама ў заканамерным узаемадзеянні (выраўноўванні) сучаснага беларускага агульнанароднага і рэгіянальнага маўлення. Неаднаразова даследчык прыходзіў да высноваў, што сінтэзаванне не толькі моўна-выяўленчых сродкаў у межах пэўнага жанру, але і саміх жанраў прыводзіць да стварэння поліфанічнай структуры маўлення, якая ўплывае як на блізкія ці суседнія жанры, так і на розныя віды, нават роды мастацкай літаратуры. Таму прадстаўнікі сацыялістычнага рэалізму надавалі вялікае значэнне так званаму вобразу аўтара, у якім арганічна спалучаюцца паводле законаў мастацкасці гутарковае з кніжным, сацыяльна-групавое з індывідуальным, нацыянальнае з інтэрнацыянальным. Наогул, на думку аўтара манаграфій, сінтэтычны характар мае не толькі ўся мова мастацкай літаратуры як суцэльная катэгорыя або той ці іншы мастацкі вобраз як пэўная дэталь літаратурна-мастацкага твора, але і асобныя, індывідуальныя рысы шматаспектнай працы беларускіх пісьменнікаў XX ст. над словам і вобразам, над літаратурна-мастацкімі тэкстамі і мікратэкстамі. Развіццё апавядальнай нормы беларускімі савецкімі пісьменнікамі, як даказвае і паказвае прафесар М. Абабурка, заключаецца ва ўскладненні ўзаемадзеяння аўтарскага маўлення і маўлення дзейных асоб, ужыванні кантэкстаў розных стылістычнай прыналежнасці, узаемадзеянні розных "суб'ектыўных" планаў, у наўмысным стварэнні індывідуальных варыянтаў агульнапрынятых нормаў (як моўных, так і маўленчых) і г. д. Таму ў значнай ступені ўзмацняецца псіхалагічны аналіз, пазалітаратурныя моўна-выяўленчыя сродкі актыўна пранікаюць у аўтарскую мову, усё выразней выяўляецца пісьменніцкая пазіцыя да выкладу і літаратурнай нормы, усё больш і больш узаемадзейнічаюць маналагічнае і дыялагічнае маўленне.

Мікалай Абабурка не спыніўся на дасягнутым, а пайшоў значна далей разгледжанага і прыйшоў да вызначэння самастойных адгалінаванняў беларускай філалогіі – беларускай лінгвістычнай паэтыкі і лінгвістычнай тэксталогіі. Вынік намаганняў вучонага – манаграфія 2008 г., у якой даказана, што прадметам вывучэння названых адгалінаванняў найперш могуць быць "думкі, вобразы, малюнкі" (Якуб Колас) пісьменніка, г. зн. не толькі яго штодзённая праца, але і праца крытыка, гісторыка, філосафа і іншых над мовай і стылем яго твора ад усіх першых рукапісных і да апошніх прыжыццёвых выданняў і перавыданняў, якія найбольш поўна і дакладна выяўляюць творчыя задумы аўтараў. На погляд М. Абабуркі, асноўныя задачы беларускай лінгвістычнай тэксталогіі такія:

1) выяўленне дапрацаваных і перапрацаваных моўных (маўленчых) адзінак, фрагментаў, раздзелаў, варыянтаў і г. д. першаснага тэксту ў параўнанні з асноўным (канчатковым, аўтэнтычным) тэкстам;

2) вызначэнне ролі фанетычных, марфалагічных, сінтаксічных, фразеалагічных, лексічных і стылістычных замен, перастановак, трансфармацый і інш.;

3) адшукванне, класіфікацыя і вызначэнне функцый разнастайных паўтораў моўных (маўленчых) сродкаў, структурных частак і інш.;

4) каменціраванне змен у структуры абзацаў, раздзелаў, параграфаў, графічнае вылучэнне, замена знакаў і г. д.;

5) параўнанне варыянтаў перакладу як паміж сабой, так і з арыгіналам, тлумачэнне прычын адхіленняў ад патрабаванняў адэкватнасці, эквівалентнасці і мастацкасці [гл.: Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння (да 95-годдзя з дня нараджэння прафесара Ф. М. Янкоўскага): зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск: БДПУ, 2013, с. 18 – 20].

Прапанаваная сістэма даследавання літаратурна-мастацкіх тэкстаў патрабуе падтрымкі з боку іншых даследчыкаў, удасканалення названых метадаў і прыёмаў пры вывучэнні заязнага маўлення, асабліва слоўнага мастацтва ("мастацтва слова"). Думаецца, што мая публікацыя пакладзе пачатак шырокаму абмеркаванню лінгвістычнай і лінгвастылістычнай дзейнасці доктара філалагічных навук, прафесара Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова Мікалая Абабуркі.

Мікалай КРЫЎКО,
вядучы навуковы супрацоўнік
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Аўтар аналізуе ганарар на развіццё часопіса.